# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 16 (616) | Чацвер, 8 мая 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

Михаил ДУДИН

## И НЕТ БЕЗЫМЯННЫХ СОЛДАТ

Гремят над землею раскаты,
Идет за раскатом раскат.
Лежат под землею солдаты,
И нет безымянных солдат.
Солдаты в окопах шалели
И падали в смертном бою,
Но жизни своей не жалели
За горькую землю свою.
В родимую землю зарыты,
Там самые храбрые спят.
Глаза их Победой закрыты,
Их подвиг прекрасен и свят...



Былыя франтавікі, падпольшчыкі, удзельнікі партызанскага руху — гордасць калектыву нашага ўніверсітэта.

**На здымку** (злева направа): супрацоўнік кафедры фізічнага выхавання палкоўнік запасу А. А. Косцікаў, падпалкоўнік запасу, старшы інжынер ІВЦ А. Д. Ложкін, былы партызан, удзельнік гістарычнага парада на Краснай плошчы ў гонар 40-годдзя Вялікай Перамогі дацэнт кафедры гісторыі КПСС Я. А. Семянчук, удзельнік партызанскага руху ў Чэхаславакіі, загадчык кафедры беларускай мовы, прафесар У. В. Анічэнка, ветэраны вайны в. а. загадчыка кафедры гісторыі СССР і БССР дацэнт Г. С. Еўдакіменка, падпалкоўнік у адстаўцы, начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі.

Фота Н. Кір'янавай.

# ДЗЕЛЯ МІРУ І ШЧАСЦЯ

**У яркім абнаўленні прыроды прыйшоў да нас май. Гэта месяц, які па-асабліваму ўздымае настрой людзей. Тыдзень таму назад разам з усім прагрэсіўным чалавецтвам планеты мы адзначылі Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных свету. І вось зноў для нас свята. Бадай, самае дарагое і памятнае. 41 год таму назад савецкія людзі разам са сваімі саюзнікамі па барацьбе з лікаваннем сустрэлі Перамогу над фашысцкай Германіяй.**

**Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў будзе слаўным праз усе вякі. Мінулая вайна з'явілася небывалай у гісторыі па маштабах і сваёй жорсткасці. Гэта была бітва першай у свеце краіны сацыялізму з найбольш рэакцыйнай ударнай сілай сусветнага імперыялізму — гітлераўскай Германіяй. На франтах Вялікай Айчыннай вайны вырашаўся лёс не толькі Савецкага Саюза, Еўропы, але і ўсяго свету.**

**Цяжкім і доўгім быў шлях да перамогі. У гады смяротнай небяспекі па закліку Камуністычнай партыі, пад яе мудрым кіраўніцтвам уся краіна паднялася на барацьбу, стала сапраўды адзіным ваенным лагерам. Мужнасць і гераізм франтавікоў зліліся с самаадданай працай патрыётаў тылу. На часова акупіраванай тэрыторыі гарэла зямля пад нагамі захопнікаў. Нязгаснай славай авеяны баявыя сцягі Савецкіх Узброеных Сіл. Вызваліўшы ад ворага Радзіму, мужныя савецкія воіны працягнулі брацкую руку дапамогі заняволеным краінам Еўропы.**

**Савецкі народ заўсёды памятае і ацэньвае вялікі ўклад, які ўнеслі ў перамогу над фашызмам арміі саюзнікаў—ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, іншыя народы. Аднак агульны вынік вайны быў вырашаны іменна на савецка-германскім фронце. І ўсё прагрэсіўнае чалавецтва аддавала і аддае вялікую даніну павагі бяспрыкладнай мужнасці і самаадданасці савецкіх воінаў, якія, не шкадуючы жыцця, змагаліся з фашызмам у імя трывалага міру на Зямлі.**

**Разгром германскага фашызму, японскага мілітарызму аказаў самае глыбокае ўздзеянне на ўвесь ход сусветнага развіцця. Атрымаўшы перамогу, савецкія людзі ўзнялі з руін, зрабілі нашу Радзіму яшчэ больш магутнай і заможнай. Натхнёныя велічнымі рашэннямі XXVII з'езда КПСС, мы з упэўненасцю глядзім у будучыню, яскрава ўяўляем яе абрысы.**

**Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, усе тыя, хто ўнёс свой уклад у вялікую Перамогу, карыстаюцца ў сацыялістычным грамадстве ўсеагульнай павагай. 46 былых франтавікоў, падпольшчыкаў, удзельнікаў партызанскага руху працуюць цяпер у нашым універсітэце. Гэта У. В. Анічэнка, У. Д. Арэшчанка, А. А. Баскакаў, Б. В. Бокуць, М. А. Дзмітрыеў, Г. С. Еўдакіменка, А. С. Калугін, А. А. Косцікаў, У. П. Ксянзоў, М. М. Маёраў, Р. С. Мільчанка, М. В. Навучыцель, П. А. Савінскі, Я. А. Семянчук, У. С. Сідараў, А. І. Украінец, І. Ф. Харламаў, В. А. Хількевіч, У. А. Шаўчэнка, М. П. Шкарбун і іншыя таварышы. Усіх іх мы добра ведаем, пра многіх расказвалася на старонках універсітэцкай шматтыражнай газеты. Гэтыя людзі і цяпер з'яўляюцца ўзорам у выкананні сваіх службовых абавязкаў, вядуць вялікую выхаваўчую і ваенна-патрыятычную работу сярод моладзі.**

**Адзначаючы Дзень Перамогі, мы ўспамінаем не толькі далёкія суровыя гады, але і думаем пра наш заўтрашні дзень. Галоўны клопат — захаваць мір, не дапусціць новага пажару вайны, самага жудаснага і разбуральнага. На гэта накіроўваем усе свае намаганні.**

**А сёння, напярэдадні Дня Перамогі, горача віншуем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, увесь калектыў універсітэта са знамянальным святам. Жадаем усім Вам, дарагія таварышы, мірнага блакітнага неба над галавой, вялікага асабістага шчасця, плённай працы на карысць нашай любімай Айчыны!**

*Са сходу прафсаюзнага актыву*

# ПАВЫШАЦЬ БАЯВІТАСЦЬ

25-га красавіка ва ўніверсітэце адбыўся сход прафсаюзнага актыву. Па дакладу старшыні прафкома **М. Н. Мурашкі** абмеркаваны задачы прафсаюзнай арганізацыі ўніверсітэта па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

У спрэчках на сходзе выступілі старшыні прафсаюзных бюро: кафедр грамадскіх навук —**Н. П. Пухава**, геафака — **М. І. Аўтушка**, бібліятэкі — **Г. М. Захарчанка**, біяфака — **Я. Е. Падутаў**, гістфіла — **Д. Д. Паўлавец**, члены прафсаюзных бюро **Э. І. Лізарава** з эканамічнага і **У. Я. Скрэжэндзеўскі** з фізічнага факультэтаў.

Як у дакладзе, так і ў выступленнях асноўная ўвага была звернута на павышэнне эфектыўнасці вучэбнай, навуковай і вытворчай работы на ўсіх факультэтах і ў структурных падраздзяленнях універсітэта. Дасягнуць гэтага можна перш за ўсё на аснове ўсямернага ўмацавання працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, далейшага паляпшэння выхаваўчай работы, каардынацыі і ўдасканальвання дзейнасці прафсаюзнай і іншых грамадскіх арганізацый. Яшчэ многае патрэбна зрабіць па павышэнню ролі працоўных калектываў, удасканальванню сацыялістычнага спаборніцтва, аднаго з важнейшых рычагоў па паспяховаму выкананню ўсіх задач, якія стаяць перад вышэйшай школай на сучасным этапе.

На сходзе гаварылася і аб тым, што на значна вышэйшы ўзровень трэба ўзняць работу пярвічнай арганізацыі таварыства барацьбы за цвярозасць.

Прафсаюзны актыў прыняў адпаведную пастанову і зацвердзіў мерапрыемствы прафкома па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Ва ўрачыстай абстаноўцы вялікай групе выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ўручаны нагрудныя значкі ВЦСПС «За актыўную работу ў прафгрупе», Ганаровыя граматы Беларускага рэспубліканскага і абласнога камітэтаў галіновага прафсаюза.

# ГДУ — НА ДРУГІМ МЕСЦЫ

Стала добрай традыцыяй правядзенне алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» паміж студэнтамі эканамічных ВНУ, факультэтаў і спецыяльнасцей. Другі тур Усесаюзнай алімпіяды праводзіўся нядаўна ў Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава. Мінчане цёпла сустрэлі сваіх гасцей. Акрамя выканання заданняў алімпіяды ў яе праграму ўвайшлі таксама культурныя мерапрыемствы. Мінчане паказалі гасцям горад, мемарыяльны комплекс «Хатынь» і Курган Славы.

З нецярпеннем чакала каманда ГДУ ў складзе студэнтаў эканомфака Г. Мамачкінай, Э. Строгіна, С. Кавалёвай, С. Папасёмавай, аўтара гэтых радкоў на чале з дацэнтам І. П. Трацэўскім і кандыдатам эканамічных навук Л. Я. Аксёнавай, як і ўсе ўдзельнікі алімпіяды, падвядзення вынікаў.

І вось яны аб'яўлены старшынёй аргкамітэта алімпіяды. Камандзе ГДУ дасталося ганаровае другое месца.

Былі адзначаны таксама работы С. Кавалёвай і Э. Строгіна, якія занялі адпаведна прызавыя першае і чацвёртае месцы.

**А. ЛАБАЧОЎ,**
**студэнт 4-га курса эканамічнага факультэта.**

# ПЕРШАМАЙСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ

Урачыста і радасна адзначана свята Першамая ў нашым універсітэце. Сёлета ён па-асабліваму знамянальны: споўнілася 100 гадоў з дня ўзнікнення міжнароднага свята салідарнасці працоўных ўсяго свету.

29-га красавіка ў актавай зале ГДУ адбыўся ўрачысты сход калектыву універсітэта, прысвечаны святу 1 Мая. На ім з дакладам выступіў загадчык кафедры гісторыі КПСС В. У. Матусевіч.

На сходзе быў зачытаны загад па універсітэту, у якім калектыў ГДУ павіншаваны са святам міру, вясны і працы, а лепшым выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам за поспехі ў працы і вучобе аб'яўлена падзяка.

1 мая ў святочных калонах дэманстрантаў прайшлі прадстаўнікі калектыву Гомельскага дзяржаўнага універсітэта па вуліцах і плошчы імя У. І. Леніна г. Гомеля. Яны прадэманстравалі сваю вернасць і адданасць справе роднай Камуністычнай партыі, гарачае імкненне адстаяць мір на планеце, мацаваць міжнародную салідарнасць працоўных усяго свету.



НА ЗДЫМКУ: у першамайскай калоне ГДУ.

Фота Н. Кір'янавай.

## *НЕЗАБЫЎНАЕ*

# СЛЯДЫ ВАЙНЫ ЗАСТАЮЦЦА НАДОЎГА

Думка, вынесеная ў загаловак, упершыню з'явілася ў мяне ў Сібіры, дзе летам 1960 года я апынуўся ў геалагічным маршруце. Я пакутліва раздумваў над круглымі варонкамі ў сасновым лесе на правым беразе ракі Байранаўкі, што ўпадае ў р. Бірусу. Што гэта? Карставыя варонкі прыроднага паходжання або штучныя, створаныя чалавекам? У маім дзённіку з'явіліся пытанні, сумненні, якія вырашыліся мясцовымі жыхарамі і гістарычнымі матэрыяламі. Аказалася, што ў 1919 г. па даліне р. Бірусы з Поўначы наступаў Шыткінскі партызанскі фронт, а бранепоезд белых біў па партызанах буйнакаліберными гарматамі. Тайга захавала варонкі часоў грамадзянскай вайны.

Сляды вайны застаюцца надоўга... Гэтая думка зноў прыйшла мне на памяць, калі ў красавіку я ехаў у г. Рагачоў. Пасажыры любаваліся цудоўнымі лясамі, што раскінуліся паміж Доўскам і Рагачовам. А мой погляд не мог адарвацца ад ледзь прыкметных варонак, акопаў і траншэй. Гэта сляды Беларускага фронта позняй восені 1943 года і вясны 44-га. У гэтых траншэях савецкія салдаты і афіцэры ў дождж, слоту і маразы, абстрэльваемыя праціўнікам, чакалі свайго часу, каб выгнаць захопнікаў з зямлі шматпакутнай Беларусі. І ён настаў 24 чэрвеня 1944 года, калі 1-ы Беларускі фронт пад камандаваннем генерала арміі К. К. Ракасоўскага разам з суседнімі франтамі пачаў аперацыю «Баграціён».

Сляды вайны застаюцца надоўга... Я стаю на высокім абрывістым беразе р. Бярэзіны каля вёскі Горваль. Тут цудоўнае агаленне парод чацвярцічнага ўзросту, якія трэцякурснікі геалагічнага факультэта ГДУ пачнуць вывучаць у пачатку чэрвеня на вучэбнай практыцы. Думкі мае толькі аб практыцы, аб тым, што гэта агаленне (прасцей кажучы, падмываемы ракой абрыў) — унікальнае. Уверсе — сасновы лес, з якога здымшчыкі збіраюць жывіцу. Раптам заўважаю траншэю каля самага краю з характэрнымі зломамі ў плане. У 150 м праходзіць другая траншэя, бачны варонкі ад мін. Пазней даведаўся, што з левага берага ракі біў нямецкі кулямёт, і яшчэ адна траншэя, якая праходзіла па полю, заараная. Тут стаяў I Беларускі фронт восенню 1943 года. Па ўспамінах мясцовага жыхара нашы войскі фарсіравалі Бярэзіну, калі на ёй ўжо з'явіўся лёд.

Вяртаючыся назад у Гомель, убачыў абеліск і агароджу вакол братняй магілы на ўскраіне Горваля і неяк па-асабліваму аднёсся да гэтай беларускай вёскі. Яна — сведка важнейшай гістарычнай падзеі пачатку аперацыі «Баграціён».

З траншэй пад Рагачовам і Горвалем I Беларускі фронт ва ўзаемадзеянні з іншымі франтамі і беларускімі партызанамі пачаў імклівае вызваленне поўдня Беларусі ў чэрвені 1944 г. Вось што пісаў маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў ва «Успамінах і роздумах»: «Камандуючы фронтам генерал арміі К. К. Ракасоўскі ў адпаведнасці з планам Стаўкі пасля стараннай даразведкі ўсёй абстаноўкі прыняў рашэнне прарваць абарону праціўніка дзвюма групіроўкамі: адной — паўночней Рагачова і другой — паўднёвей Парыч. Гэтым дзвюм групіроўкам ставілася бліжэйшая задача разграміць супрацьстаячага праціўніка і сыходзячыміся ўдарамі абедзьвюх груп акружыць Жлобін-Бабруйскую групу і ліквідаваць яе». Як вядома, план Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання I Беларускі фронт бліскуча выканаў. Праз некалькі дзён пасля пачатку аперацыі, 27 чэрвеня 1944 г. у раёне Бабруйска ўтварыліся два катлы, у якіх апынуліся нямецкія войскі агульнай колькасцю 40 тысяч чалавек.

...Сляды вайны застаюцца надоўга. Памяць народа аб загінуўшых вечная.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі.**

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ГРУПА — У ІНТЭРНАЦЕ

Адным з важных напрамкаў у рабоце кафедры ўсеагульнай гісторыі цяпер стала шырокая прапаганда сярод насельніцтва матэрыялаў XXVII з'езда КПСС. З гэтай мэтай на кафедры створана інфармацыйная група. Сваю чарговую сустрэчу яна правяла ў інтэрнаце № 1 са студэнтамі-гісторыкамі. На ёй прысутнічалі загадчык кафедры дацэнт Р. Р. Лазько, кандыдат гістарычных навук В. Ф. Маслюкоў, асістэнт Я. А. Броўкін. Сустрэча была прысвечана абмеркаванню знешняй палітыкі СССР, цэнтральным напрамкам якой на прадстаячыя гады павінна стаць барацьба за рэалізацыю вылучанай у Заяве Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ад 15 студзеня 1986 г. праграмы знішчэння ядзернай зброі і недапушчэння новай сусветнай вайны.

Адказваючы на пытанні, якія паступілі ў паштовую скрынку інфармацыйнай групы, Р. Р. Лазько ўказаў на глыбокае пераасэнсаванне XXVII з'ездам КПСС міжнароднага становішча. Ва ўмовах ядзернай пагрозы склаліся ўмовы, у якіх супрацьборства паміж капіталізмам і сацыялізмам можа працякаць толькі і выключна ў формах мірнага суіснавання. Вучоны адзначыў, што рэакцыйныя сілы амерыканскага імперыялізму ігнаруюць аб'ектыўныя рэальнасці і накаляюць міжнародную абстаноўку.

Я. А. Броўкін на канкрэтных прыкладах паказаў агрэсіўную сутнасць амерыканскага імперыялізму. Ён звярнуў увагу на ўзмацненне ваенна-прамысловага комплексу ЗША і мілітарысцкага псіхозу ў гэтай краіне.

Другім напрамкам у рабоце інфармацыйнай групы было абмеркаванне сучаснага стану міжнароднага камуністычнага руху, які з'яўляецца важнейшай сілай грамадскага прагрэсу. У апошнія гады са старонак буржуазнага і сацыял-рэфармісцкага друку не зыходзіць тэзіс аб «крызісу» камуністычнага руху, страце ім гістарычнай перспектывы. Пры ацэнцы дзейнасці ІКП, ФКП быў дадзены адпор буржуазным фальсіфікатарам. Разам з тым студэнты атрымалі адказ на пытанне аб праблемах камуністычнага руху,

На пытанні аб становішчы ў Кітаі, краінах Афрыкі адказаў В. Ф. Маслюкоў.

**А. БАБКОЎ,**
**дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у маі 1986 года.**

1. **Раўняцца на подзвіг** (да 41-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.).

**Матэрыял публікуюць усе газеты.**

2. **Клопаты аб чалавеку — у цэнтр увагі** (аб прынятай XXVII з'ездам КПСС праграме ў галіне сацыяльнай палітыкі).

**У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі, вывады і ўстаноўкі, якія змяшчаюцца ў дакументах і рашэннях XXVII з'езда КПСС, у прамове таварыша Гарбачова М. С. на сустрэчы з працоўнымі горада Тальяцці. Рэкамендуецца выкарыстаць Пастанову ЦК КПСС «Аб асноўных напрамках паскарэння вырашэння жыллёвай праблемы ў краіне» («Праўда», 24 красавіка г. г.).**

3. **Па пасадзе і абавязку** (Аб грамадзянскім абавязку савецкага чалавека жыць і працаваць сумленна, старанна выконваць свой службовы, грамадскі і маральны абавязак).

**Гутарку рэкамендуецца будаваць на канкрэтных прыкладах з жыцця свайго калектыву.**

4. **Затраціць менш — зрабіць больш і лепш** (аб актыўным удзеле ўсіх і кожнага ў барацьбе за эканомію матэрыялаў, сыравіны і энергіі, за забеспячэнне ўсяго прыросту выпуску прадукцыі за кошт рэсурсазберажэння).

**Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».**

5. **Лінія міру супраць лініі, якая вядзе да вайны** (Аб новых буйнамаштабных ініцыятывах Савецкага Саюза, накіраваных на ўмацаванне міру і бяспекі народаў, ліквідацыю ядзернай пагрозы, спыненне гонкі ўзбраенняў.

**У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі і вывады, якія змяшчаюцца ў выступленнях М. С. Гарбачова на XI з'ездзе САПГ і на дружалюбнай сустрэчы на заводзе ў Берліне, у дакладзе Э. А. Шэварднадзе на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.**

## *Студэнцкія канферэнцыі*

# ДАСЛЕДУЮЦЬ БУДУЧЫЯ ЭКАНАМІСТЫ

На эканамічным факультэце адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя. На ёй трэцякурснікі спецыяльнасці эканоміка працы зрабілі справаздачу аб сваёй навуковай рабоце, якую яны выконваюць пад кіраўніцтвам кандыдата тэхнічных навук дацэнта Б. І. Врублеўскага.

Э. Гаўрылава выступіла з цікавым паведамленнем аб выяўленні ёй запасаў бытавога лому каляровых металаў, якія ўтвараюцца ў маштабах горада і вобласці і не знаходзяць прымянення ў прамысловай перапрацоўцы. Студэнтка прапанавала магчымыя шляхі яго выкарыстання.

А. Міронавай і А. Чарняўскай быў падрыхтаваны даклад аб нізкім узроўні выкарыстання харчовых рэсурсаў на прадпрыемствах грамадскага харчавання г. Гомеля. Студэнткамі прыводзіліся лічбы, якія паказвалі, што пытанні паляпшэння якасці прадуктаў грамадскага харчавання яшчэ чакаюць свайго вырашэння.

На канферэнцыі быў заслуханы таксама даклад аб праблемах зніжэння матэрыялаёмкасці, стварэння процізатратнага механізма ў маштабах народнай гаспадаркі, аб шляхах шырокага прыцягнення ў прамысловую вытворчасць другасных рэсурсаў.

**А. ЛІШЫК,**
**студэнт 3-га курса эканамічнага факультэта.**

## *Падарожжы актывістаў СБА*

# ДРУЖБА НАМ КРЫЛЫ ДАЕ

Камуністычная партыя Савецкага Саюза, разглядаючы на XXVII з'ездзе пытанні далейшага ўдасканальвання сацыялізму і паступовага пераходу краіны да камунізму, паставіла задачу паляпшэння падрыхтоўкі моладзі да самастойнага жыцця і працы. «Абавязак старэйшых пакаленняў, — сказаў на з'ездзе Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў, — рабіць усё, каб змена была больш разумнай, здольнай, адукаванай, каб яна дастойна несла ў будучае эстафету ідэалаў справядлівасці і свабоды, завяшчаную Вялікім Кастрычнікам».

Адной са школ падрыхтоўкі да жыцця, працы студэнцкай моладзі з'яўляецца яе ўдзел у будаўнічым руху. У ім пад кіраўніцтвам Ленінскага камсамола ідзе станаўленне арганізатарскіх і выхаваўчых навыкаў будучых спецыялістаў, магчымасцей і патрэб кожнага ўдзельнічаць у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы. Для прыцягнення вузаўскай моладзі да канкрэтнай працы камсамол выкарыстоўвае розныя формы і метады. Вялікую ролю ён адводзіць маральнаму заахвочванню ўдзельнікаў СБА.

Па выніках працоўнага семестра-85 9 студэнтаў нашага універсітэта заслужылі ганаровае права стаць удзельнікамі двухтыднёвай паездкі па Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Імі былі І. Братчэня, Т. Казлянок, Н. Карман, М. Лапіцкі, Ю. Тарасенка, Т. Гацуліна, Л. Сініла, Н. Друк і аўтар гэтых радкоў. Мы зрабілі захапляючае падарожжа ў ГДР у саставе цягніка дружбы, у якім знаходзіліся 420 студэнтаў з ВНУ Украіны, Беларусі, Узбекістана, Латвіі і Літвы, Алтайскага і Стаўрапольскага краёў РСФСР.

Дэлегацыю нашай рэспублікі прадстаўлялі 41 студэнт і выкладчык Гомельскай вобласці. Арганізаваная па гораду Кіеву экскурсія, баль Дружбы згуртавалі студэнтаў яшчэ да выезду ў ГДР. Душой паездкі стаў камісар абласнога штаба СБА І. Застанкевіч. Час у дарозе быў запоўнены рознымі конкурсамі, дыспутамі, спаборніцтвамі.

І вось ГДР. Нас сустрэў гід групы Маціас. Ён пазнаёміў гасцей са сталіцай рэспублікі, дзе мы наведалі музеі, Брандэрбургскія вароты. З хваляваннем і гордасцю за наш савецкі народ, яго воінаў мы схілілі галовы каля Вечнага агню ў Трэптаў-парку, дзе знаходзіцца помнік савецкаму воіну-вызвалiцелю.

У Берліне адбылася і першая наша сустрэча з членамі Саюза Свабоднай Нямецкай Моладзі (ССНМ). Нас цікавіла ўсё аб іх жыцці, справах, захапленнях. Адказы на пастаўленыя пытанні дапамаглі нам лепш зразумець маладых грамадзян сацыялістычнай Германіі.

Пасля знаёмства з Берлінам наша дэлегацыя наведала Патсдам — рэзідэнцыю прускіх каралёў XVIII ст. Тут мы пазнаёміліся з цудоўным помнікам мастацтва Сан-Сусі (дом без клопатаў) — летняй рэзідэнцыяй караля Фрыдрыха II і Цыцыліенхоф — месцам, дзе праходзіла вядомая Патсдамская (1945 г.) канферэнцыя, якая рашала лёс пасляваеннага ўладкавання Германіі. З вялікім хваляваннем студэнты праходзілі па пакоях, дзе размяшчалася дэлегацыя Савецкага Саюза і дзе прымаліся гістарычныя рашэнні.

Наступным буйным горадам, дзе зрабіла прыпынак наша група, быў Лейпцыг. Старажытны нямецкі горад, горад кірмашоў, які падтрымлівае сувязі са 100 краінамі, займае 3-е месца па продажу футра ў свеце. Усе старыя будынкі беражліва ахоўваюцца і цесна звязаны з кірмашамі, якія праводзяцца два разы ў год. Экскурсавод паказаў нам царкву святога Томаса, дзе доўгі час іграў Бах, помнік бітвы народаў, узведзены ў гонар воінаў 1812 года, музей Дзімітрава, у якім мы ўбачылі залу, дзе так бліскуча Дзімітраў атрымаў перамогу над фашызмам, абвінаваціўшым камуністаў у падпале рэйхстага.

У Эйленбургу, невялікім гарадку пад Лейпцыгам, адбылася наша сустрэча з моладдзю ГДР, рабочымі аднаго з заводаў. Яны расказалі нам аб сваёй рабоце, праблемах, радасцях. У сваю чаргу нашы рабяты падзяліліся ўражаннямі ад паездкі па ГДР, адказалі на пытанні нямецкіх сяброў.

Усяму свету вядомы нямецкі горад Веймар. Тут жылі і тварылі нямецкія паэты, пісьменнікі, кампазітары: Шыллер, Гётэ, Ліст, Бетховен, бывалі Бах, Міцкевіч, Талстой, Андэрсэн, Карамзін, Кюхельбекер, Жукоўскі... У гэтым невялікім гарадку ёсць помнікі

*На іх раўняем крок*

# НЕЎМІРУЧАСЦЬ ПОДЗВІГУ

**Шлях твой цяжкі быў,**
**не усцелены ружамі,**
**Шлях твой суровы,**
**Вера Харужая!**
**Ды не прыстала нідзе ты,**
**не збочыла,**
**Цераз віхуры,**
**нястомная крочыла...**
**П. БРОЎКА.**

Амаль у самым цэнтры горада Бабруйска, па вуліцы Пушкіна, перад вялікім, светлым будынкам 27-ай сярэдняй школы стаіць бюст Веры Харужай, слаўнай дачкі нашага народа, імя якой з гонарам вымаўляюць усе беларусы. Пра яе жыццё-подзвіг многа напісана празаікамі і паэтамі. Ёй прысвечаны шматлікія вершы і песні, кнігі і зборнікі.

Вера Захараўна Харужая ўступіла ў рады бальшавіцкай партыі ў далёкім 1921 годзе. З 1922 г. яна займаецца ў Мінскай саўпартшколе, дзе актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, многа друкуецца ў рэспубліканскай перыёдыцы, займаецца самаадукацыяй.

Пасля паспяховага заканчэння партшколы В. Харужая па заданню партыі накіроўваецца для арганізацыі падпольнай барацьбы ў Заходнюю Беларусь, якая ў той час знаходзілася пад уладай белапольскіх захопнікаў. Камуністу, які павінен быў займацца партыйнай дзейнасцю ў такіх цяжкіх умовах, заўсёды патрэбна было памятаць аб правілах канспірацыі, каб ніякім чынам не раскрыць перад ворагам сваю арганізацыю, не даць зачэпкі для слежкі. І Вера Захараўна паказала сябе сапраўдным майстрам падпольнай барацьбы. Яна вельмі многа выступала перад рабочымі і сялянамі на шматлікіх сходах, мітынгах, вясковых вечарынках і, што патрэбна адзначыць яшчэ, аратар заўсёды ўмела для любой аўдыторыі падабраць патрэбнае слова, дапамагчы кожнаму слухачу разабрацца ў складаным грамадскім становішчы таго часу. Праз некальскі месяцаў пасля пераходу савецка-польскай граніцы імя «Верка» (адзін з падпольных псеўданімаў В. Харужай) было шырока вядома сярод абяздоленых. У хуткім часе яна выбіраецца ў склад ЦК камсамола Беларусі і адначасова з'яўляецца членам ЦК камсамола Польшчы і членам Кампартыі Заходняй Беларусі.

На працягу двух гадоў ворагі не маглі напасці на след бясстрашнай камуністкі, але, нарэшце, 15 верасня 1925 года яе арыштоўваюць і пілсудскі суд асуджае падпольшчыцу на 6 гадоў турэмнага зняволення, другі раз —у Беластоку, Веру Захараўну прыгаварылі да 8 гадоў пазбаўлення волі. У час допытаў патрыётка не сказала ніводнага лішняга слова, не дала магчымасці следчым раскрыць падпольную арганізацыю, напасці на след барацьбітоў за вызваленне беларускага народа. Нават ворагі здзіўляліся мужнасці маладой камуністкі, яе веры ў перамогу светлага будучага.

У турме Вера Захараўна разам з некаторымі таварышамі па падполлю, якія таксама апынуліся за кратамі, працягвае барацьбу, толькі тут змяніліся формы гэтай барацьбы, яшчэ больш жорсткай была цэнзура і ўмовы жыцця. Палітвязні, чым толькі маглі, дапамагалі адзін другому, імкнуліся падтрымаць у гэтых цяжкіх выпрабаваннях найбольш знясіленых і хворых. У турме камуністка піша палымяныя адозвы і лісты да сваіх сяброў на волі. Усе гэтыя допісы потым будуць аб'яднаны ў кнігу пад назвай «Пісьмы на волю». Вельмі высокую адзнаку ім дала Н. К. Крупская. Яна пісала: «...з кожнага радка глядзіць на вас чалавек моцнай волі, пераканаы рэвалюцыянер, барацьбіт за рабочую справу...».

Толькі ў 1932 годзе, калі паміж урадамі СССР і Польшчы быў праведзены абмен палітвязнямі, Вера Захараўна апынулася на тэрыторыі Савецкай Беларусі.

Пасля кароткага адпачынку (турэмнае зняволенне адбілася на здароўі), Вера Харужая зноў прыступае да актыўнай грамадскай дзейнасці. З'яўляюцца яе брашуры «За чырвоны Кастрычнік на Заходняй Беларусі» і «Мы — маладая гвардыя рабочых і сялян». Пад імі стаяў псеўданім аўтара «Алеся Шыпшына». Пад адной са сваіх брашур Вера Захараўна падпісалася «Антолька», але справа ў тым, што гэта быў псеўданім яе сяброўкі — Зосі Панковай, з якой яны разам сядзелі ў турме. У Зосі, у турэмнай камеры, нарадзілася дзіця. Гледзячы на тое, як мужна маладая маці пераносіць усе цяжкасці, нават сама Вера Харужая пазайздросціла яе вытрымцы і сіле волі. Выйшаўшы на свабоду, Вера Захараўна, аддаючы даніну павагі сваёй сяброўцы, падпісалася чужым псеўданімам пад тэкстам асабістай брашуры. Дарэчы, абедзьве палымяныя патрыёткі-камуністкі загінулі ад рук фашыстаў у Віцебскай турме ў 1942 годзе. Але гэта было пазней, а пакуль што рэдактарская праца не задавальняла неспакойнае сэрца загартаванай бальшавічкі, і яна едзе на Прыбалхашбуд, дзе працуе ў гаркоме партыі. Таварышы, якія сустракалі нашу зямлячку на будоўлі, ці працавалі разам з ёю, успамінаюць: «Яна не ведала, што такое разгубленасць, была спакойнай, не баялася цяжкасцей, аб недахопах гаварыла прама ў вочы і заўсёды справядліва. У выніку камуністка Вера Харужая была любімым кіраўніком і дарадчыкам» (газета «Ленінскі голас»).

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі Вера Захараўна едзе працаваць туды, дзе прайшла яе камсамольская маладосць — у Пінскую вобласць. Спачатку яе прызначаюць у Целяханы, а потым пераводзяць у Пінск, у распараджэнне абкома партыі. Праўда, нядоўга давялося савецкім людзям пажыць пад мірным небам. Пражэрлівы фашысцкі звер напаў на нашу краіну, і зноў давялося ўчарашнім сейбітам і рабочым брацца за зброю, каб бараніць сваю родную старонку. Крыху пазней Вера Харужая пісала: «Я павінна пакінуць дзяцей, таму што мяне кліча вайна, барацьба за наш край, за нашу ўладу, за нашу свабоду, за маю Беларусь». Разам са сваім мужам яна ўступае ў партызанскі атрад, якім камандаваў В. З. Корж. У адным з першых баёў з фашысцкімі захопнікамі пад г. п. Лагішын яе муж, Сяргей Карнілаў, загінуў...

Але, Вера Захараўна Харужая не скарылася, яна працягвала змагацца да апошняй хвіліны свайго жыцця, якое гэтак любіла. У адным з лістоў яна пісала: «Жыццё бязмежна прыгожае, а жыццё ў злучэнні з барацьбой — гэта шчасце». Яна бачыла сваё шчасце ў служэнні людзям, у барацьбе супраць ненавіснага старога, і людзі ўдзячны ёй за гэта.

**А. НЕНАДАВЕЦ,**
**асістэнт кафедры**
**рускай літаратуры.**

*Навіны культурнага жыцця*



# Аб мастацтве Францыі

У інтэрнаце № 4 адбыўся вечар, прысвечаны французскай паэзіі, музыцы і жывапісу. На яго сабраліся прадстаўнікі розных факультэтаў, аматары французскага мастацтва.

Вечар адкрыла другакурсніца эканамічнага факультэта Таццяна Окрут. Затым гучалі цікавыя паведамленні аб вядомых спеваках, паэтах, кампазітарах Францыі. Ірына Кацуба расказала аб папулярным аркестры Поля Марыа, Таццяна Цітова — аб выканаўчым майстэрстве Джо Дасэна, Святлана Хадакоўская — Шарля Азнавура, яго складаным творчым шляху. Студэнты даведаліся шмат цікавага і аб славутай французскай спявачцы Эдзіт Піаф. Расказала аб ёй Таццяна Вараб'ёва.

Пранікнёна гучалі вершы французскіх паэтаў у выкананні выкладчыцы С. Ф. Карнаухавай, студэнтак гісторыка-філалагічнага факультэта А. Бандарэнка і А. Слепянок.

У антракце ўдзельнікам вечара былі прапанаваны галаваломкі на кемлівасць. Да прадстаўленых малюнкаў «Што б гэта азначала?» трэба было прыдумаць жартоўныя дасціпныя подпісы. Аўтары лепшых з іх былі ўзнагароджаны. Студэнты прынялі таксама ўдзел у віктарыне па гісторыі і мастацтву Францыі. Пераможцы атрымалі прызы.

Не менш цікавай была і другая палова вечара. Вельмі карысную, змястоўную гутарку правяла выкладчыца замежнай мовы Людміла Сямёнаўна Кавалеўская. Яе расказ быў прысвечаны асноўным цячэнням у французскім жывапісу, аб больш значных карцінах яна расказала падрабязна, прадэманстравала іх на вечары з дапамогай слайдаў.

Правядзенне вечароў на замежнай мове — добрае пачынанне. Няхай яно стане традыцыяй!

**Р. КАГАН,**
**выкладчыца кафедры нямецкай**
**і французскай моў.**

# У ТЭАТРАЛЬНАЙ ГАСЦІНАЙ

Месцам цікавых сустрэч стала тэатральная гасціная універсітэта. Нядаўна жаданымі гасцямі тут былі акцёры Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Іх запрасілі да сябе студэнты, якія спецыялізуюцца па кафедры оптыкі, і слухачы народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Сустрэча прысвячалася Міжнароднаму дню тэатра.

Тэатр — адзін з самых выдатных старажытных відаў мастацтва. Якія ж гістарычныя этапы яго развіцця? Аб гэтым расказалі прысутным у сваіх дакладах студэнткі гр. Ф-33 фізічнага факультэта Л. Майсеенка і Г. Петухова.

Працяглы і складаны шлях развіцця тэатра абумоўлівае і сённяшні яго дзень, яго традыцыі, праблемы. Аб усім гэтым у гасцінай вялася ажыўленая дыскусія. У ёй удзельнічалі народная артыстка БССР Н. Карнеева, акцёр драмтэатра А. Караткевіч, загадчыца літаратурнай часткай драмтэатра С. Патапенка. Яны адказалі таксама на многія ўзніклыя пытанні, пазнаёмілі студэнтаў з рэпертуарам абласнога драмтэатра на сёлетні сезон.

Абмен думкамі з акцёрамі праходзіў ва ўзаемнай даверлівасці, адкрытай гутарцы, якая была, бясспрэчна, карыснай і вельмі цікавай для ўсіх прысутных.

**В. ШОЛАХ,**
**асістэнт кафедры оптыкі.**

*У студэнцкіх творчых калектывах*



**Штогод, вясной, акцёры студэнцкага народнага тэатра ГДУ «Люстэрка» робяць перад гледачамі чарговую справаздачу — выносяць на яго суд новы спектакль. Сёлета тэатр ажыццявіў пастаноўку сатырычнай аповесці-казкі В. Шукшына «Пункт погляду».**

**Прэм'ера спектакля засведчыла: самадзейныя акцёры разам з рэжысёрам тэатра А. М. Бычковым добра справіліся з пастаўленай перад імі задачай.**

**НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля.**

**Фота Н. Кір'янавай.**

Пушкіну, Гётэ і Шылеру, адзіны на кантыненце помнік Шэкспіру.

Аднак Веймар вядомы не толькі сваімі памятнымі месцамі, звязанымі з жыццём і творчасцю вялікіх людзей. Пад Веймарам знаходзіўся канцлагер Бухенвальд, які захаваны як папрок фашызму і пастаянна нагадвае аб трагедыі сусветных войн. Тут загінуў слаўны сын нямецкага народа Эрнст Тэльман, 100-годдзе з дня нараджэння якога нядаўна адзначалася ва ўсім свеце.

У Бухенвальдзе мы пазнаёміліся з былым вязнем канцлагера Эрнстам Хортманам. Да Вялікай Айчыннай вайны ён быў сакратаром маладзёжнай арганізацыі, членам Камуністычнай партыі. У 1933 г. па фальшываму абвінавачванню Хортман быў арыштаваны і доўгія гады пакутаваў у канцлагеры. Член нямецкага камітэта, потым — міжнароднага камітэта супраціўлення, ён расказаў аб барацьбе вязняў, аб тым, як нягледзячы на вялікую небяспеку, яны здолелі вынесці па частках з завода, на якім працавалі, 94 вінтоўкі.

Апошнім горадам у маршруце нашага падарожжа па ГДР быў Дрэздэн—Фларэнцыя-на-Эльбе, як называюць яго жыхары. Тут з 500 тысяч насельніцтва — 40 тысяч студэнтаў. У горадзе — 6 тэатраў, 8 ВНУ, адзін тэхнічны універсітэт. У горадзе створан студэнцкі гарадок, галоўнай адметнасцю якога з'яўляецца будынак тэхнічнага універсітэта. Тут з 1933 г. была турма, у якой казнілі больш дзвюх тысяч камуністаў і іх прыхільнікаў. На гэтым месцы ўстаноўлена памятная дошка, а ўнізе будынка знаходзіцца музей.

Універсітэт мае 25 факультэтаў, на якіх рыхтуюць спецыялістаў па 100 спецыяльнасцях. У гарадку ёсць спартыўныя збудаванні, сталовыя, бібліятэкі, інтэрнаты, свае яслі і дзіцячыя сады. Адпачыць можна ў студэнцкім парку. Аб гэтым мы даведаліся ад студэнтаў тэхнічнага універсітэта, якія запрасілі нас ў маладзёжны клуб, створаны і абсталяваны іх рукамі.

З Дрэздэна вельмі хутка можна дабрацца да Саксонскай Швейцарыі (так назвалі гэтыя месцы швейцарцы, таму што лясы і горы вельмі нагадваюць іх радзіму). У Саксонскай Швейцарыі мы гулялі па гарах, наведалі крэпасць Кенігштайн.

На вялікі жаль, на наведванне Цвінгера з яго славутымі калекцыямі нам было адведзена нямнога часу. Аднак мы пастараліся ўважліва азнаёміцца з карціннай галерэяй і калекцыяй фарфору. Затым адбылася экскурсія ў так званыя «зеленые своды» — скарбніцу каралёў, дзе знаходзяцца вырабы з золата, брыльянтаў і іншых каштоўных каменняў і металаў.

ПРОЙДУЦЬ гады. Але гэта паездка назаўсёды застанецца ў памяці ўдзельнікаў студэнцкага цягніка дружбы. Яна пазнаёміла нас з гісторыяй, жыццём братняй сацыялістычнай краіны, яе маладым пакаленнем. Савецкія студэнты і іх сябры з ГДР на сумесных сустрэчах прыйшлі да агульнага разумення: мір і сацыялізм — неаддзельныя.

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**член камітэта ЛКСМБ ГДУ,**
**студэнтка гр. Г-41 гістфіла.**

*Конкурсы*

# «ГЕОЛАГ» — ЛЕПШАЯ НАСЦЕНГАЗЕТА

**Па традыцыі ў Дзень друку камісія з прадстаўнікоў парткома, прафкомаў, камітэта камсамола універсітэта падвяла вынікі агляду-конкурсу насценных газет факультэтаў. Упершыню лепшай прызнана насценгазета «Геолаг» з геафака. Другое месца прысуджана газеце «Эканаміст» з эканомфака, трэцяе — «Праметэй» з гістфіла, чацвёртае — «Архімед» з фізічнага факультэта, пятае — «Біёлаг» з біяфака, шостае — «Спорт» з факультэта фізвыхавання. Насценная газета матэматычнага факультэта на конкурс не была прадстаўлена.**

**Камісія адзначыла, што універсітэцкі насценны друк патрабуе значнага паляпшэння.**

## *Уключайцеся ў пошук*

# ПАМЯЦЬ АБАВЯЗВАЕ

Два гады народная асвета краіны развіваецца ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Прыкметна павысілася ўвага да прафесіі педагога. Клопаты партыі, урада аб народнай адукацыі, удасканальванні яе сістэмы, аб настаўніку бачацца ў канкрэтных мерах. Прафесія настаўніка — адна з самых адказных і ўдзячных. Яе роля і значэнне будуць пастаянна ўзрастаць.

«Народны настаўнік, — адзначаў У. І. Ленін, — павінен быць у нас пастаўлены на такую вышыню, на якой ён ніколі не стаяў і не стаіць і не можа стаяць у буржуазным грамадстве».

Вырашаючы задачы сённяшняга дня, заглядваючы ў будучыню, нельга забываць мінулае нашай краіны. У параўнанні былога з цяперашнім нараджаецца гордасць за бацькоў і дзядоў, ператварыўшых некалі адсталую краіну ў перадавую дзяржаву, нараджаецца імкненне зрабіць яе яшчэ больш магутнай і прыгожай.

Гісторыя краіны — гэта і гісторыя народнай адукацыі, гісторыя Настаўніка, яго рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя подзвігі, яго шляхі станаўлення.

Амаль усе вучні, камсамольцы і піянеры ведаюць імёны выдатных герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ведаюць пра здзейсненыя імі подзвігі. Аднак далёка не кожны можа назваць людзей, заваяваўшых усенароднае прызнанне самаадданай працай на педагагічнай ніве.

Устанавіць імёны невядомых герояў, расказаць пра іх подзвігі народу, увекавечыць іх памяць, стварыць гісторыю народнай адукацыі Гомельшчыны — мэта клуба «Пошук», які існуе пры Гомельскім педагагічным вучылішчы. Яго членамі з'яўляюцца выкладчыкі, навучэнцы, выпускнікі, усе тыя, для каго дарагі вобраз Настаўніка.

Гомельскаму педвучылішчу нядаўна споўнілася 70 гадоў. Гэта адна са старэйшых навучальных устаноў у вобласці. З яе сцен выйшлі многія тысячы спецыялістаў, якія абаранялі заваёвы Вялікага Кастрычніка, здзяйснялі велічныя планы пяцігодак, змагаліся за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сёння шырока вядомыя імёны былога дырэктара гомельскай СШ № 2 Героя Савецкага Саюза Б. Ф. Калача, поўнага кавалера ордэнаў Славы дэлегата XXVI з'езда КПСС дырэктара гомельскай СШ № 44 М. А. Лебедзева, Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага настаўніка школ БССР, дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі Гомельскага дзяржуніверсітэта М. А. Дзмітрыева. Першай у нашай рэспубліцы ганаровае званне «Народная настаўніца СССР» прысвоена В. С. Аўраменка з Уваравіцкай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна, прымаўшай удзел у рабоце XXVII з'езда КПСС.

337 настаўнікам Гомельшчыны прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік школ БССР», 2038 з'яўляюцца выдатнікамі народнай асветы рэспублікі, многія педагогі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод, выбраны ў кіруючыя партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія органы, працуюць настаўнікамі-метадыстамі і старшымі настаўнікамі.

Па падручніках доктара педагагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта АПН СССР, загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ І. Ф. Харламава навучэнцы і студэнты сёння авалодваюць асновамі майстэрства педагагічнай працы.

Гомельскае педагагічнае вучылішча цесна звязана з вядучай вышэйшай навучальнай установай Беларускага Палесся — Гомельскім дзяржаўным універсітэтам. Менавіта ў яго сценах (на чацвёртым паверсе вучэбнага корпуса № 2 па вул. Кірава) размяшчаліся пасля Вялікай Айчыннай вайны аўдыторыі нашага педвучылішча. Яго многія выпускнікі павышалі адукацыю і працягваюць вучобу ў ГДУ. У сваю чаргу некаторыя выпускнікі універсітэта ўліваюцца ў педагагічны калектыў педвучылішча.

Вось чаму мы, члены клуба «Пошук», звяртаемся да выкладчыкаў, студэнтаў універсітэта, просім кафедру педагогікі і псіхалогіі аказаць нам дапамогу ў зборы матэрыялаў для ствараемага музея народнай асветы Гомельшчыны. Мы заклікаем усіх, хто хоць колькі-небудзь зацікаўлены ў гэтым, выказваць свае прапановы па арганізацыі музея, прыносіць і дасылаць для яго самыя разнастайныя матэрыялы аб Настаўніку — дакументы, фотаздымкі, рэпрадукцыі з карцін, выразкі з газет і часопісаў, кнігі, пласцінкі, песні пра настаўніка, значкі, маркі і г. д.

**Пастаўленую перад сабой задачу мы можам паспяхова вырашыць толькі агульнымі намаганнямі.**

**С. КАЦУБА,**
**старшыня савета клуба «Пошук» Гомельскага педагагічнага вучылішча.**



ВЯСНЯНКА. Фотаэцюд Н. Кір'янавай.

*Кансультацыя юрыста*

# МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Маладыя спецыялісты, якія закончылі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з адрывам ад вытворчасці, камісіяй па персанальнаму размеркаванню накіроўваюцца на работу і абавязаны адпрацаваць пасля заканчэння ВНУ не менш трох гадоў. Прадастаўленне работы маладым спецыялістам у планавым парадку — адна з гарантый забеспячэння права грамадзян СССР на працу, замацаванага Канстытуцыяй СССР. Час знаходжання ва Узброеных Сілах СССР залічваецца ў тэрмін абавязковай работы па прызначэнню пасля заканчэння навучальнай установы. Маладыя спецыялісты, у якіх час работы пасля заканчэння ВНУ і службы ва Узброеных Сілах СССР складае менш трох гадоў, пасля іх звальнення ў запас абавязаны вярнуцца на работу на прадпрыемства, ва ўстанову і арганізацыю, куды яны былі накіраваны камісіяй па персанальнаму размеркаванню.

Маладыя спецыялісты забяспечваюцца работай у адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю і кваліфікацыяй. Кіраўнікам прадпрыемстваў (арганізацый) забаронена звальняць іх з работы без згоды Міністэрства на працягу трох гадоў пасля заканчэння навучальнай установы.

Маладым спецыялістам, якія накіроўваюцца на работу пасля заканчэння навучальнай установы, даецца месячны водпуск незалежна ад таго, калі яны мелі апошнія канікулы ў навучальнай установе. За час водпуску маладым спецыялістам-стыпендыятам выплачваецца дапамога ў размеры месячнай стыпендыі за кошт прадпрыемства, установы, арганізацыі, у якія яны накіроўваюцца на работу. Выпускнікам, атрымаўшым магчымасць пастулаць на работу самастойна, дапамога за час водпуску не выплачваецца. Маладым спецыялістам, не прыступіўшым да работы ў сувязі з прызывам на воінскую службу, выплачваецца выхадная дапамога ў размеры палавіны месячнай стыпендыі (калі яны яе атрымлівалі на момант заканчэння навучальнай установы) за кошт сродкаў навучальнай установы.

Пры накіраванні маладых спецыялістаў ў парадку размеркавання на работу, калі гэта звязана з пераездам у іншую мясцовасць, выплачваюцца кампенсацыі і даюцца гарантыі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Яны маюць права:

— на аплату кошту праезду работніка і членаў яго сям'і: па чыгунцы — у плацкартным (купэйным) вагоне, па водных шляхах — у каюце 3-й катэгорыі, на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання (акрамя таксі), паветраным транспарце — па тарыфу звычайнага класа;

— на аплату расходаў па правозу маёмасці чыгуначным, водным, аўтамабільным транспартам да 500 кг на самога работніка і да 150 кг на кожнага пераязджаючага члена сям'і;

— на выплату работніку за кожны дзень знаходжання ў шляху сутачных у размеры 2 руб. 60 кап., а пры пераездзе ў раёны Крайняй Поўначы і мясцовасць, якая прыроўніваецца да гэтых раёнаў, — 3 руб. 50 кап;

— на выплату работніку заработнай платы, зыходзячы са службовага акладу па новаму месцу работы за дні збораў у дарогу і ўладкаванні на новым месцы жыхарства, але не больш 6 дзён, а таксама за час знаходжання ў дарозе;

— на выплату адначасовай дапамогі на самога работніка ў размеры яго месячнага службовага акладу па новаму месцу работы і на кожнага пераязджаючага члена сям'і ў размеры чвэрці дапамогі самога работніка.

Маладым спецыялістам, накіраваным на работу ў парадку размеркавання па месцу знаходжання навучальнай установы, дзе яны вучыліся, адначасовая дапамога выплачваецца, калі яны да навучання пастаянна пражывалі ў іншай мясцовасці.

Калі загадзя немагчыма дакладна вызначыць размер належачых работніку кампенсацый, то яму выдаецца аванс. Усе расходы па выплаце кампенсацый нясе прадпрыемства, установа, арганізацыя, у якія накіроўваецца малады спецыяліст.

Малады спецыяліст абавязаны вярнуць выплачаныя яму сродкі, калі ён не з'явіўся на работу або адмовіўся прыступіць да працы без уважлівай прычыны.

Маладыя спецыялісты забяспечваюцца жылой плошчай прадпрыемствам, установай, арганізацыяй, у якія яны накіраваны пры размеркаванні. Месца ў інтэрнаце з'яўляецца часовай мерай забеспячэння маладога спецыяліста жылой плошчай.

Маладым спецыялістам час вучобы ў вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе (у тым ліку на падрыхтоўчым аддзяленні) не перапыняе працоўнага стажа.

В. РУПІН,
юрысконсульт ГДУ.

## СПОРТ

# «СЕРАБРО» ГАНДБАЛІСТАК

У Гомелі адбыліся гульні заключнага тура на першынство Беларусі па ручному мячу сярод жанчын. Барацьбу за ўзнагароды вялі каманды Мінск-1, за якую выступалі гандбалісткі БПІ, заваяваўшыя сёлета пуцёўку ў вышэйшую лігу СССР, Мінск-2, ГДУ, Брэсцкага педінстытута і Магілёўскай вобласці.

На турніры яўным фаварытам была першая каманда беларускай сталіцы. Яна лёгка адолела ўсіх саперніц і ўпэўнена заваявала званне чэмпіёна.

Каманда ГДУ (трэнер В. Крукоўскі) уступіла толькі старшым па спартыўнаму рангу, а ва ўсіх астатніх сустрэчах таксама дабілася пераканаўчых перамог і стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату. Бронзавыя ўзнагароды дасталіся гандбалісткам Магілёўшчыны.

**(Наш кар.)**

# УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ БЕГУНА

У нядзелю, 27 красавіка, удзельнікі клуба аматараў бегу «Універсітэт» прынялі ўдзел ва Усесаюзным дні бегуна. У масавым забегу па вуліцах г. Гомеля паспяхова выступілі студэнты Л. Савельева, Т. Мацвеева, Л. Варонік, М. Пабудзінская (гісторыка-філалагічны факультэт), І. Бандзюк, Т. Кавалёва, С. Кутасава, І. Таўкіна, Р. Кулагін (матфак), А. Яноўскі з факультэта фізічнага выхавання. Добрыя вынікі паказалі таксама выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ: В. Залатарэнка з фізічнага факультэта, які заняў 2-е месца ў сваёй узроставай групе, В. Мярэжа (матфак) і С. Маслак з кафедры фізічнага выхавання.

Усе ўдзельнікі атрымалі памятныя пасведчанні аб удзеле ў прабегу.

**А. ГРЫШАЧКІН,**
**старшыня клуба аматараў бегу.**

# АДКРЫЦЦЁ СЕЗОНА

Адкрыццём новага лёгкаатлетычнага сезона спартсменаў ГДУ з'явіўся вясенні лёгкаатлетычны крос, у якім прынялі ўдзел 280 лепшых спартсменаў універсітэта.

На ўрачыстым адкрыцці спаборніцтваў са словамі прывітання да ўдзельнікаў звярнуўся в. а. старшыні спартклуба ГДУ Г. І. Варатніцкі, які адзначыў даўнія традыцыі універсітэцкіх кросаў. У іх прымалі ўдзел спартсмены, якія неаднойчы апраналі алыя майкі з гербам СССР, і абараняўшыя спартыўны гонар краіны на спаборніцтвах рознага рангу — ад міжнародных матчавых сустрэч да Алімпійскіх гульняў. Гэта майстры спорту міжнароднага класа В. Сапея, М. Кіраў, Я. Гаўрыленка, А. Неўскі.

І вось выстрал стартавага пісталета абвясціў аб першым старце сезона. Трэба адзначыць, што ён быў паспяховым для каманды факультэта фізвыхавання, якая заняла першае месца. На другім і трэцім — адпаведна будучыя фізікі і матэматыкі.

На дыстанцыі 500 м у дзяўчат першымі былі прадстаўніцы гісторыка-філалагічнага факультэта. Перамагла Лілія Савельева з вынікам 1 мін. 26.3 сек. Каманда дзяўчат з матфака, якая заняла ўвесь п'едэстал гонару, зноў пацвердзіла, што ўжо на працягу некалькіх гадоў ёй няма роўных на дыстанцыі 1000 м. У гэтым немалая заслуга яе трэнера А. Р. Грышачкіна. Лідэр Святлана Кутасава паказала вынік 3.27.8 сек.

На дыстанцыі 1000 м сярод мужчын поспех спадарожнічаў фізікам, якія занялі ўсе прызавыя месцы (трэнер Г. П. Барадзіна). Вынік пераможцы Сяргея Зайцава — 2.46.5 сек. На дыстанцыі ўтрая даўжэйшай першым быў Антон Яноўскі з факультэта фізічнага выхавання. Ён атрымаў перамогу з вынікам 9.57.0 сек.

**В. ЗАЛАТАРЭНКА,**
**адказны за спартыўны сектар прафбюро фізічнага факультэта.**


Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ23416

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 336.